**Кастусь Жмінько**

# КАСТУСЬ КАЗАЎ...

Гайнаўка-Брэст 2008

TOWARZYSTWO OCHRONY KRAJOBRAZU

Жмінько, К.Ф.
Кастусь казаў : афарызмы, меркаванні, развагі / Кастусь Жмінько
– Брэст

У гэтай кнізе сабраны трапныя, афарыстычныя выказванні аўтара, занатаваныя ім на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Яны вызначаюцца дасціпнасцю і лаканічнасцю, прыцягваюць увагу чытача бяскрыўдным гумарам і едкай іроніяй.

# З ГОРЫЧЧУ І ГУМАРАМ...

Ёсць кнігі, якія нельга напісаць у маладосці: на іх мае права толькі мудрая сталасць. Такой кнігай, на маю думку, з'яўляецца зборнік афарыстычных выслоўяў "Кастусь казаў...".

Ужо перагортваючы старонкі першай кнігі Кастуся Жмінько "Між вамі" (1999 г.), можна было заўважыць: асаблівую прывабнасць, лагічную завершанасць надаюць творам менавіта афарыстычныя канцоўкі, якія атрымалі з часам права на самастойнае жыццё. Дарэчы тут будзе ўспомніць радкі паэта (на той, перабудовачны, час высокапастаўленага кіраўніка, якому здаровы духоўны стрыжань не дазволіў сесці "на ланцуг спакусы на чырвоным сытным двары"): "Твой шлях ёсць пошук шляху", "А сябры гараць, бы знічкі, – папаўняюць Млечны Шлях", "З унукам гадзіннік новы пра што павядзе размовы?" ці зноў жа, пра сябе самога : "Жмінько не браў паўнюткай жменяй, ды нат у шчэпці не хапаў". А хапалі і ха́палі. З прайдзісветамі і хапугамі змагаўся па абавязку службы (не шкадуе едкага слова і цяпер) Кастусь Фёдаравіч. На мой погляд, яго выказванні на адрас чыноўнай і наменклатурнай набрыдзі – найбольш моцнае звяно і ў першым раздзеле, "Сабе ды іншым", і ў другой частцы дадзенай кнігі. Чаго вартае толькі "Згарэла на злодзею

шапка – выдалі папаху”!? Вобразна і дакладна. Пакрывіць душою той з нас, хто скажа, што ў яго царстве-ведамстве такім чынам ніколі не ўлагоджвалі высокапастаўленых “пагарэльцаў”. А як вы думаеце, пра каго наступны афарызм-загадка: “Даўганосы і цыбаты сцежкі круціць каля хаты”? Не, бусел тут ні пры чым.

Не ўтрымаюся, каб паводле Жмінько даць тлумачэнне некаторым этычным катэгорыям, хоць бы наступным: фанабэрыстасць – “высакаверхая шапка на галаве амбітнага недаростка, да таго ж не свая”; праўда – “пакутлівае немаўля, якому хлусня-павітуха балюча спавіла цельца, не даючы магчымасці свабодна дыхаць”... Як мне здаецца, афарыстычныя выказванні першай часткі кнігі – арыгінальны, аўтарскі жанр Кастуся Жмінько, своеасаблівыя “малыя” формы публіцыстыкі.

Афарызмы другой часткі надзвычай разнастайныя тэматычна. Іх, пры ўсім жаданні, цяжка было “ўбіць” нават ва ўмоўныя раздзелы і давялося збіраць у апошнім, аднайменным з назвай кнігі. Аўтар разважае над такімі праблемамі як дабро і зло, беднасць і багацце, розум і дурнота, народ і ўлада, жыццё і смерць...

Але не ўсё так змрочна. Несумненна, удзячны чытач не аднойчы шчыра засмяецца, а то і соладка прыцмокне, чытаючы досціпы, аб’яднаныя пад назвай “Дазволь, маладзіца...”. Каб паказаць, што гэта сапраўды так, прывяду, грэшны, некалькі назіранняў, з якімі можа не пагадзіцца хіба што “адпеты” жанчыназненавіснік. Вось яны: “І пад удавой салома трэцца”, “Не хвалі халявы з паненкай на лаве”, “Калена аб калена трэцца – душа саграецца”...

Шчыра жадаю Кастусю Жмінько новых кніг паэзіі (ведаю, што рыхтуецца зборнік), прозы (думаю, такая кніга абавязкова напішацца), а таксама творчых удач у выяўленчым мастацтве. Няхай ніколі не будзе перанасычанасці пастаянствам і творчыя Музы заўсёды спадарожнічаюць на шляху “ў свет за добрымі людзьмі”.

*Мікола Сянкевіч*

# САБЕ ДЫ ІНШЫМ

***

Сумленных людзей не трэба заклікаць да прыстойнасці стосамі ўказаў, дэкрэтаў, законаў. Яшчэ і таму гэта шкодна, што ў кожным з іх аўтар абавязкова пакінуў чорны лаз для сябе.

***

Усякая ініцыятыва знізу – гэта разбурэнне непагрэшнага іміджу кіраўніка, які лічыць сваю пазіцыю да канца прадуманай і адзіна правільнай. Таму запалоханым падначаленым боязна даваць канструктыўныя прапановы, а лепей і далей падтакваць, каб быць пажаданымі.

***

Калі да вяршынь улады прыходзяць пакрыўджаныя ў дзіцячым узросце, дрэнна становіцца ўсім. Не давайце ў крыўду дзяцей – сваю старасць.

***

Сусвет падзелены на аднолькава роўныя часткі, якія ўвесь час варагуюць: зло і дабро, любоў і нянавісць, свабода і няволя. Чалавеку ўвесь час даводзіцца выбіраць. Менавіта таму існуе жыццё.

***

Нават мудрацы на сконе дзён сваіх не могуць паведаміць, на якім дне знаходзіцца ісціна: кожны жыве і паміраe са сваёй.

***

Калі заканчэнне тваёй песні з'яўляецца запевам песні дзяцей і вучняў – гэта і ёсць жыццё.

***

Грунтоўны, узважаны падыход да любых, на першы погляд, самых нязначных праяў жыцця – нялёгкі інтэлектуальны скарб мудрых людзей. Скарбонка ветрагонаў заўсёды пустая.

***

Калі твае добрыя намеры, высокія памкненні ўзгадавалі парасткі высакародных учынкаў, –
гэта і ёсць шчасце.

***

Нават выпадковая ганебная думка выклікае страх у сумленнага чалавека, перакананага ў яе матэрыяльнасці.

***

Беражыце сваё "Я", не пакідайце без нагляду, не здавайце на захоўванне. Я – гэта гонар і годнасць чалавека.

***

Баяліся: метал у голасе. І што ж?.. Фантан славаблудства з’ела іржа, ім жа і народжаная.

***

Мудрасць і здароўе даюцца чалавеку Небам, і гэта найвышэйшая праўда зямлі.

***

У гісторыі чалавецтва яшчэ столькі невядомых вялікіх і мудрых, што наўрад ці хопіць часу выказацца. Супакойвае іншае: яны таксама не паспелі.

***

Не кожны дар пускаюць на карысць людзям.

***

Чамусьці права крытыкаваць даюць разам з пасадай, а дарэмна: такое права – спрадвечная прэрагатыва разумных і мудрых людзей.

***

Разумных і мудрых да высокіх пасад не дапускаюць, як і сумленных: туды заўсёды адбіраюць сабе падобных, пераконваючы, што яны найбольш вартыя.

***

Мяжа сапсаванасці – высокая пасада, атрыманая ад рукі прайдзісвета і хапугі за ўдыганне і нараўленне.

***

Маўчанне мудрых старцаў – заўсёдная тэма для балбатлівых дамарослых філосафаў.

***

Сумленны чалавек нясе ў душы не толькі цяжар жыцця, што выпаў на яго долю. Яму сорамна за чэрствасць і маральную разбэшчанасць іншых. І гэтая па добрай волі ўзваленая на сябе ноша не менш цяжкая.

***

Разумныя знойдуць тэму ў мудрых для размовы нават пры поўным маўчанні.

***

Пра што маўчалі геніі слова, ніколі не раскажуць нават самыя аўтарытэтныя тэарэтыкі і гісторыкі літаратуры.

***

Не ўсім дадзена прысутнічаць пры нараджэнні мудрасці і таленту.

***

Дабро не мае патрэбы ў рэкламе: бескарыслівыя ўчынкі, немітуслівае жыццё без хлусні і насілля над жывым светам і прыродай – найлепшая агітацыя людзей прыстойных і сціплых.

***

Празорцы не радуюцца ад усведамлення выключнасці свайго дару, празорцы пакутуюць.

***

Калі думка выкладчыка, доказная і абгрунтаваная, прымусіла студэнта засумнявацца хоць бы ў некаторых беспярэчных пастулатах маладосці – гэта поспех.

***

Кепскую думку перамагае добрая, добрую думку – лепшая. У гэтым існасць.

***

Калі баліць цела – ягоную боль павінна ўлагоджваць душа. Колькі людзей загінулі ад таго, што не знайшлі раўнавагу цела і душы.

***

Жадаць і летуценіць – прыемны занятак; адмовіцца ад аданага на карысць бліжняга – учынак мудрасці.

***

Высокія званні, пасады і ўзнагароды не даюцца ніколі разам з вярыгамі высакароднасці і разважлівасці.

***

Высакароднасць – гэта мудры дар зямлі, на якой ты рос, сэрцам і розумам слухаючы толькі яе: гасцінец дадзены нямногім.

***

Ад вышыні званіц не залежыць меладычнасць звону: даўжэй адбіваецца рэха, і толькі. Самыя высокія званіцы займаюць званары ад улады.

***

Не кожны званар закране сэрцы вернікаў: мудрае сэрца мае надзвычай тонкі музычны слых.

***

Даверам заслугоўваюць сяброўства, мудрасцю – павагу і пашану.

***

Дрогкія прыступкі службовай пасады – непераадольная перашкода агульначалавечай маралі, якая зрываецца ў бездань. Чым вышэй – тым ніжэй. Раўнавага...

***

Прынцыпы – гэта не пасада, якой можна пазбыцца па віне вар’ята-начальніка.

***

Блізарукі кіраўнік абрастае падхалімамі, дальнабачны – падае руку апанентам.

***

Як сорамна пры людзях за падзяку, няхай сабе і заслужаную, якая гучыць з вуснаў несумленнага начальніка. А яшчэ горай бачыць у сваёй асабістай справе станоўчую характарыстыку за подпісам кіраўніка-хапугі. Уратуй вас, Божа, ад такога прыкрага адчування.

***

Мы пяем славу палкаводцам-пераможцам, хоць іншы раз большай пашаны заслугоўвае той, хто прымірыў ворагаў.

***

Фанабэрыя і самазадаволенасць злятаюць дзьмухаўцом разам з пасадай, дурнота застаецца назаўсёды.

***

Хлусня – несмяротная свойская жывёліна, якая перадаецца ў спадчыну і трушчыць плады радаслоўнага дрэва.

***

Хабар, распуста і хлусня – салодкія, спакуслівыя віры заганы, і толькі на іх дне (а гэта шлях без прыпынкаў) адчуваецца запозненая гарката.

***

Чалавечая мудрасць – гэта самы вялікі дар багоў, які ахоўваецца сіламі пазнання і спакою.

***

Разумны спакой ніколі не дазваляе зрабіць вялікага глупства.

***

З цягам часу разумны чалавек набывае мудрасць, дурнота адзявае панцыр непагрэшнасці.

***

Пошук непазнанага, пакутлівыя разважанні над непазнаным, рэдкія знаходкі, пастаянныя сумненні і расчараванні – незайздросны лёс тых, хто выбраў для сябе выбоісты шлях пасціжэння ісціны.

***

Дабрачыннасць не за свой кошт – гэта яшчэ не дабрадзейнасць... Кішэня фундатара становіцца паўней, а людская – пусцей.

***

На гэтым свеце раўнапраўных ніколі не будзе, нават вернікаў – у царкве, а хворых – у бальніцы.

***

Нават маленькая чародка авечак заўсёды падымае многа пылу, калі выбраны не той шлях. Чарада перапуджаных авечак заўсёды збіваецца ў купу і падымае клубы пылу, не ведаючы, як і дзе ратавацца.

***

Што пазнаў на сабе, раскажы людзям. Магчыма, некаму гэтым дапаможаш.

***

Заклікаць зняважанага і пакрыўджанага да цярпімасці і ўсёдаравальнасці – блюзнерства, бо тым самым мы заклікаем абражальніка здзекавацца і рабаваць?

***

Цяжка чалавеку знайсці сваё “Я” ў лабірынце спакуслівых сцежак і дарог жыцця, у агромністым кастравішчы “МЫ”.

***

Паважаючы чужую старасць, мы паважаем тым самым сваю будучыню. Бумеранг прыроды няўмольны, калі толькі табе не суджана пакінуць свет маладым.

***

Бог аднолькава адмераў кожнаму чалавеку на яго кароткі век радасці і тугі, перамогі і паражэнняў, шчасця і пакутаў, дабрабыту і беднасці, здароўя і хвароб.... Але лёс не дазволіў яму ведаць, калі гэта ўсё праяўляецца ў поўную меру.

***

Які цяжар нясе сэрца мудрага чалавека, калі ён прылюдна стрымлівае ў душы глыбіню тугі і вышыню радасці!

***

“Паплавок” – тып начальніка, які, баючыся памыліцца, ухіляецца ад вырашэння глабальных праблем, а штодзённа забівае службовы час дробязямі – у большасці сваёй, сямейнымі.. “Паплавок” пускае па вадзяных затоках ледзь бачныя кругі і цягне па ілістым дне гнілы корч (імітацыя дзейнасці).

***

Схуднелы ад працы вол паслабленае ярмо на шыі ўспрымае як гаспадароў клопат і шчаслівым рыкам “Вольны!” – хлусіць сабе і другім.

***

Адкуль у гняздзе высакародных бацькоў з’яўляюцца “зязюльчыны” дзеці: ці то пераблыталі ў радзільным доме, ці то бацькі не высакародныя.

***

Адмова ад юру робіць жаданні шчырымі і нястрымнымі, а каханне гарачым.

***

У апраметнай цемры нават светлячок адчувае сябе бліскучай зоркай.

***

Старасць – гэта, акрамя ўсяго, вяртанне ў дзяцінства, калі здзяйсняюцца самыя неабдуманыя ўчынкі, падзіцячы смелыя і сумленныя.

***

Пасля разлікаў з пратэзістам трэба берагчы яшчэ і зубы.

***

Любое вялікае зборышча немінуча да чаго-небудзь ды прывядзе: хмара – навальніцу, зброя – вайну, людскі натоўп – пагром, сыравінны адыход – прыродны катаклізм... Якая ж сіла і мудрасць патрэбны, каб быць гэтаму апазіцыяй.

***

Не надакучай сябру сваімі праблемамі – рызыкуеш страціць яго. Сапраўдны сябар сам адчуе патрэбу і час дапамагчы.

***

Курынае кудахтанне не ад радасці, што чубатая знесла яйка: скончыўся боль.

***

Не пазайздросціш раганосцу: скінуў рогі, узняў галаву, затрубіў, як алень, – хараство! І не здагадваецца, што вызваліў месца новым рагам.

***

Краіны і народы – гэта паддоследныя на выпрабавальным палігоне жыцця. Толькі навошта Ўсявышняму вякамі на адных ставіць эксперыменты па выжыванні, другіх выпрабоўваць багаццем і раскошай.

***

Парадчыцца пад сябе – шчаслівая магчымасць крыклівых уладальнікаў сучасных памперсаў; перапісваць “пад сябе” гісторыю і законы – дзіцячая хвароба дарослых.

***

Незаслужаная ўзнагарода разбэшчвае і падштурхоўвае да заганы – нараджае псеўдавелічнасць.

***

Як лёгка мы часам верым у хлусню аб нечуваных памерах чужых заробкаў! Магчыма, гэта адбываецца таму, што сумленны чалавек не лічыць патрэбным пераконваць нас у адваротным.

***

Грошы, здабытыя любым непрыстойным шляхам, абавязкова нясуць на сабе праклён, які некалі паслужыць дэтанатарам бяды.

***

Фанабэрыстасць – высакаверхая шапка на галаве амбітнага недаростка, да таго ж не свая.

***

Чужыя поспехі слепяць вочы зайздроснікам. Менавіта зайздрослівыя людзі ўгледзелі плямы на сонцы.

***

Асабістая нажыва і выгада ніколі не змогуць ужыцца з сумленнем і велікадушнасцю. Нешта павінна ўзяць верх.

***

Папулізм, густа замешаны на хлусні, – рошчына, якая, на жаль, ніколі не пракісае.

***

“Дабрачыннасць” – часта не што іншае, як зручная маска для прыкрыцця ганебных учынкаў і грашовага чорнага налу. Калі такой дабрачыннасцю карыстаюцца людзі пры ўладзе – гэта карупцыя.

***

Кожная новая “каманда” як умее ўдасканальвае законы, праводзіць рэформы. І толькі араты ды сейбіт кожны раз застаюцца сам-насам са сваімі спрадвечнымі праблемамі.

***

Усякі рэфарматар (ці перашкаджае прагрэсу, ці спрыяе яму) – гэта кастапраў, што працуе на адкрытай ране. Народ – яго пастаянны пацыент.

***

“Адпаведнасць”: чалавек з нізкімі здольнасцямі і такім жа інтэлектам зніжае да свайго ўзроўню высокую і адказную пасаду.

***

“Дэмакратызацыя”: масавае ўсеагульнае ўхваленне ідэй правіцеляў, нават тыранаў і дэспатаў. Іншы раз апалагеты “дэмакратыі” дабаўляюць да гэтага паняцця самыя экзатычныя азначэнні.

***

Прыгажосць жаночай душы ўратоўвае свет ад вар’яцтва, а чароўна-маляўнічае хараство яе цела нараджае грэшную спакусу. Шчаслівы, хто адкрыў гэта для сябе своечасова.

***

Патрыятызм моцны ўзаемнай любоўю і пашанай. Аднабокі патрыятызм – гульня ідэолагаў, якія пажаданае выдаюць за рэальнае.

***

Жыццё – чалавечы вулей, засмечаны правінцыйны рынак са злодзеямі, вымагальнікамі і скразнякамі. Найгорш адчуваюць сябе на ім дзеці, кветкі жыцця. Не пакідайце іх надоўга без нагляду.

***

Патрыятызм – гэта не толькі “бярозавы сок”, якім краіна шчодра адорыць вясною. Сапраўдны патрыятызм памірае толькі разам з чалавекам.

***

З першых дзён жыцця дзіцяці неабходна вучыць яго дабру, каб замацаваць той кволы імунітэт чысціні, з якім немаўля нарадзілася.

***

Як такое назваць, калі з надзела зямлі, набытага непасільнай працай тваімі прашчурамі-рупліўцамі і пасля “дабравольна” аддадзенага калгасу, сёння ты павінен выкупляць жабрацкія “соткі”. Што заўгодна гэта, толькі не патрыятызм.

***

Патрыятызм патрэбны жывым для ўшанавання памяці памёрлых, вартых славы патрыётаў.

***

Чысціня паводзін – гэта натуральны вынік суладдзя думкі і душы, якія супрацьстаяць назойліваму бруду паўсядзённасці.

***

Праўда, патрыятызм, ахвярнасць – словы, якія заўсёды стаяць у адным радку.

***

Ахвяра – сястра праўды, вязень – брат патрыёта – маюць аднолькавы лёс.

***

Ашуканства і хлусня часта захопліваюць стратэгічныя вышыні, таму праўдзе ўсё цяжэй адбівацца, тым больш што хаўруснікі любяць насіць адзенне сваіх праціўнікаў.

***

Праўда – гэта пакутлівае немаўля, якому хлусня-павітуха балюча спавіла цельца, не даючы магчымасці свабодна дыхаць.

***

Праўда – высакароднае хлебнае калоссе, што жывіцца сокамі роднай зямлі, хлусня – самасейка-пустазелле, якое перашкаджае каласам даспяваць. Вырывайце пустазелле, будзьце дбайнымі гаспадарамі на родных нівах.

***

Караля, які клапоціцца толькі пра шанаванне сваёй вялікасці, нельга западозрыць у любові да каралеўства.

***

Пакланенне тым, хто знаходзіцца на самым вільчыку ўлады – жабрацкі варыянт патрыятызму.

***

Як не згадзіцца з гісторыкамі, якія настойліва сцвярджаюць, што менавіта фанатызм ідалапаклоннікаў не аднойчы быў прычынаю гібелі чалавечых цывілізацый.

***

Страшна падумаць: калі б у часы ліхалецця ўсе сапраўдныя патрыёты аддалі жыццё за Радзіму, што тады?..

***

Рыбацкая прынада ў першую чаргу нясе згубу галодным і пражэрлівым жыхарам ручая. Сыты пячкур ад яе адвярнецца.

***

”Я адмаўляюся ад улады і гатоў ахвяраваць жыццём, каб толькі ў краіне панавалі мір і спакой”... Упэўнены, што гэтыя словы не належаць ніводнаму з дыктатараў мінулага. Праўда, некаторым іх прыпісалі паслужлівыя гісторыкі.

***

Ад надта шырокіх крокаў, здараецца, трашчаць па швах штаны. Ад хады на месцы ці надта дробных – яны працірающца ў самых непрыстойных месцах. Нікога не слухайце, ідзіце сваім вольным крокам!

***

Паэзія – гэта праца разумнага сэрца і творчы рай душы ў сувоі з падзёншчынай.

***

Заслугоўвае пашаны ўсякае крацяня, нават калі яно рые норку на тваёй уласнай зямлі.

***

Камень за пазухай – вялікая сіла, калі ведаеш яго сапраўдны кошт.

***

Калі з першых дзён сумеснага жыцця ваша жонка штодзень лічыць хатнія затраты, магчыма, яна шукае падставы для скандалу ці разводу. Не дайце ёй такога шансу – зарабляйце больш.

***

Народжаны поўзаць – лётае ў марах, таму ў некаторых кабінетах высокія столі.

***

Настальгія – гэта вартая жалю плаксівая старасць, якая запознена дакарае бяздумную маладосць.

***

Інфляцыя – гэта балючы і паўзучы шлях народа ў бядоту.

***

Доўга жыць – гэта яшчэ не значыць мець права не даваць жыцця іншым.

***

Спазненне на працу "кампенсуе" ранні адыход.

***

Там воля, дзе няма людзей, існасць волі – асабістае сумленне.

***

Агульная народная любоў да правадыра з цягам часу падштурхоўвае яго да дыктатуры.

***

Зерне мудрасці збірайце маладымі, а сейце сталымі.

***

Валуны – гэта акамянелыя душы памёрлых.

***

Усякае вяртанне – доўгая дарога доўгу, якая паўтараецца толькі ва ўспамінах, сцяжына памяці, якую прайсці больш немагчыма.

***

Шлях вызначае мудры, геній яго пракладвае, таленты выбіраюць крок, а дурню ўсё гэта па цымбалах.

***

Дэмаграфічны выбух душы творчага чалавека – гэта імкненне абараніцца ад усіх, хто намагаецца прабрацца ў яе з чорнага лазу.

***

Доўга перад вачыма начальства не пакруціцца нават ваўчок – памятай, што і тылы даніну плацяць.

***

Падначалены-ваўчок не можа бясконца круціцца перад вачыма шэфа: закончыцца завод, зламаецца спружына, урэшце, можа проста надакучыць угодлівы і манатонны гул.

***

Ружа ў букеце з іншымі кветкамі не жыве і прыносіць сябе ў ахвяру: высакароднасць, шляхецтва ці пагарда?..

***

Прыгаворанаму да смерці праз павешанне даюць кароткае слова і доўгую вяроўку.

***

Вочы – для размовы, вусны – для пацалунка, цела – для кахання, галава – для думкі, толькі душа застаецца табе.

***

Разумным няма любімай работы: дурнямі занята.

***

Шчасце – гэта дазвол Бога дакрануцца рукою да яго нябачнай барады.

***

Дзяцінства – гэта час захаплення дзіцяці навакольным светам ці непрыняцця яго праяў. Ад гэтага залежыць, што прарасце ў душы, любоў або нянавісць.

***

Спазнай Сусвет, каб свет спазнаў цябе, і стань вядомым свету.

***

Жывіце і вучыцеся ў жыцця, магчыма, тады вас пачнуць разумець людзі і нехта прыслухаецца да вашага неназойлівага слова!

***

Бессмяротнасць – гэта жыццесцвярджальны душэўны парыў даўжынёю ў жыццё.

# КАНАПКІ

## ТАК І ЖЫВУ...

Так і жыву: вочы – да долу, горб угору.
Жыццё добрая штука, у каго яно добрае.
Жывецца – пачуваецца: вол працуе, кныр валяецца.
Ідылія: вол працуе, кот марцуе, жонка дома не начуе.
Сячэ доля колас: і голас, і волас.
Хараша жывем – на печы воду п’ем.
Светла жывем – ад свечкі да акенца.
Ёсць свечка, аконца – навошта нам сонца.
Весела жывем, а слёзы самі капаюць.
Жыву не тужу: вялікую шапку на “дзякуй” нашу.
Жыву не прашу: у шапцы вялікай падзякі нашу.

## ШЧАСЦЕ НА ПАРОГ....

Шчасце на парог, нядоля – пад акно.
Прыгажосць і шчасце – не адным прычасцем.
Па вуліцах шчасце не бадзяецца.
Шмат вулачак, а шчасця няма.
Там шчасце хутка пралятае, дзе нядоля
на мыліцах кавыляе.
Шчасце ў цуглях не ўтрымаеш.
Зноў беларусам дарога абрусам.

## ЗАПАВЕТ ДЛЯ СЫНА...

Запавет для сына: Гонар і Айчына!
Шукаеш волю – знойдзеш долю.
Новай сукняй гонар не заменіш.
У кожнага поля свая доля.
Вольны не прагне хавацца ў раі.
Мустангу і залатая падкова – няволя.
У вольнага бабра і зубы мацнейшыя.
Праўда згарае – іскрынкі разлятаюцца.
Птушачка радасць мае, калі вольна спявае.
Усякае поле сцеражэ доля.
Гонар у адной сукенцы доўга не схаваеш.
Дзіравая кішэня гонар не трымае.

## МІНУЛАЕ – ТВАЁ...

Мінулае – тваё, а будучае злавіць трэба.
Ад вітання да развітання дурны час паўзе,
а добры – ляціць.
Прыгадаў былое і стаў сляпым.
Дзед ашукаў – унук рэшту атрымаў.
Бацька заслужыў, сыну адгукнулася.

## СТАРАСЦЬ НА СПІНЕ...

Старасць на спіне, а розуму няма.
Маладзіцца стары як певень веснавы.
Старасць у маладосці не пытаецца.
Ранняя старасць не адзнака вялікай мудрасці.
Сівізна ў барадзе, а розум дзе?
Горб падабраў, а розуму не знайшоў.
Пастарэў, а мала ведаю.
На сівую галаву і летам шэрань сядае.

## ЗА ЧУЖЫ ГРОШ...

За чужы грош будзеш сёрбаць пусты боршч.
На чужыне і расінка – сірочая слязінка.
На чужыне мулка і ў дамавіне.
Пры чужой чарадзе не гаўкай нідзе.
За парогам чужым пабудзь нямым.
Чужы конь у балота скіне.
Выперла рабрыны ад чужой пярыны.

## ЗГАРЭЛА НА ЗЛОДЗЕЮ ШАПКА...

Згарэла на злодзею шапка – выдалі папаху.
Запусціў жменю ў чужую кішэню.
У злодзея адабранае і святы схавае.
Чужы воз у свае вароты – разлічымся потым.
Каго злавілі – той і злодзей.

## ЧОРНАЕ НЕ АДБЕЛІШ...

Чорнае не адбеліш, а толькі запляміш.
Паганае зелле добраму плоду жыцця не дае.
Благі чалавек заўсёды сляпы на адно вока.
Для благога і шчырыя словы – слата.
І для бабра няма дабра.
Свет без добрых людзей – цемра.
На свет праз добрых людзей.
У свет за добрымі людзьмі.
Благая навіна не славіць чабана.
Ад пачутай гадасці не бывае радасці.
Добрыя весткі збіраюць, благія – распускаюць.
Добрае ў паветры вісне, благое чорт у горла ўцісне.
Благая справа – злыдню забава.
Для злыдня Захара благое – забава.
Сапраўднае дабро візітовак не носіць.
Чорная душа з белай не сябруе.
На сапраўдным цельніку палосы не размываюцца.
Чорная душа ля белай чысцей не стане.
На добры “дзякуй” кішэню знойдзе ўсякі.
Вось і добра нам, калі вас няма там.

## ХЛУСЛІВАЕ І КРАДЗЕНАЕ...

Хлуслівае і крадзенае багатаму дадзенае.
Брахня па свету ляціць, а праўда вочы слепіць.
У хлусні шырокія крылы.
Хлуснёю жывеш – праўды не прызнаеш.
Брахнёю вушы чысцяць, каб завёўся нячысцік.
Той праўду спазнае, хто аб ёй дбае.
Хто рэжа праўду-матку, той малую мае зарплатку.
Сказаныя словы рэшатам не прасееш.
Праўду сеюць, хлусню пажынаюць.
Праўда сее, хлусня жне.
Пасеянае сумленне заглушаецца зеллем.
У хлусні твар не ружавее.
Сорам сумленнаму – фарба на твар.
Пад маску сорам не пралезе.

## ШТО НАКАПАЛІ...

Што накапалі – дакопіны адабралі.
Благі конь людзям, а здохне – шкада будзе.
Гібець і працаваць – атаманам не бываць.
Жалеза так пяе, як каваль куе.
Не праб'еш каляіны – не набярэш малінаў.
Мазалі на руках золатам не ўпрыгожыш.
Для труценя Адама любая Ева пчолка.
Дамовіліся мурашы будаваць шалашы на шашы.
Адпачыла сякера на калодзе, дый годзе.
Сякерка ў лесе не сумуе.
Асірацела ралля: забрала сейбіта зямля.
Пры добрай рабоце пяе лыжка ў роце.
Пупам грошы нажывеш – грыжы не мінеш.
Гаршкі багам святыя лепяць.
Без пары ботаў – няма работы.
Наша жыта гарбом нажыта.
Не хваліся збажыною – хваліся збожжам.
Капялюш мокры – кошык поўны.
Фарбуе Хвядора дзіркі ў заборы.
Прыйшоў з дарогі – даверху ногі.

## СПАЗНІЎСЯ ДА СТАЛА АДАМ…

Спазніўся да стала Адам – збянтэжыў апетыт гасцям.
Не прасі нічога ў неба, калі ёсць скарынка хлеба.
Сеў вячэраць – не марудзь, і пра “дзякуй” не забудзь.
Прадчуванне абеду саладзейшае за дрэнны абед.
Пасябравалі свініна з гусяцінай ля куска ялавічыны.
Мякіну з хлебам і сляпы не зблытае.
Смачны пірог да языка не дакранаецца.
І ад салодкага пірага бывае ікаўка.
Накормленага воўка бярлог чакае.
Нават сыты воўк салаўёў не слухае.
Хутка есць – не азначае, што ўсюды паспявае.
Не ў службу ежа.
Па вялікіх пастах масла танней.
Пакуль чалавек жыве, хлеб расце.
Перасоленую ежу кухарка глытае.
Татары ў госці – гаспадару косці.
Пустыя каласы – краса полю, поўныя – свірану.
Кашу заварыў – цуры пасёрбаў.

## БЕДНЫ НЕ ПЛАНУЕ...

Бедны не плануе, голы не сумуе.
Не ў кожную хатку світанкам цячэ смятанка.
Да агульнай хадзіць – сваёй не мець.
Па беднаму скочкі – гуляй без сарочкі.
Беднаму сніцца скарынка, сытаму – скарбонка.
Бедны загранарыўся, ды жывот разгаварыўся.
Голаму дзюркі не сорам, калі дзеткі на лаўках хорам.
Не сорам зрэб'е на целе, як дзеці лаўкі абселі.
Не гаўкай, сабача, мы не крадзём, жабрачым.
Да таго, хто нічога не мае, блыха сватоў засылае.
Багатаму – лес на палаты, а беднаму – трэскі за плату.
Адным – дажынкі, другім – дажыўкі.
На харч харошы няма гроша.
Той жыве горш, хто хлебча пусты боршч.
У беднай хаце і сцены галосяць.
Адна радасць для пана: торба стала танна.
Што ўдзень, што ўночы – конь рабочы.
Наспее час, і ў багаты курнік свой шашок панадзіцца.
Жуй, Барыска, чужыя агрызкі.

Збягаліся мышы на хлеб Ярмішын.
Небарака злавіў рака.
Такія смешкі: багачу – баравікі, бядоце – сыраежкі.
Атрымай спажывецкую торбу і жабруй, пакуль не зносіцца.
Хто голад зведаў – без перабору паабедаў.
Хто голад зведаў – пра меню не пытаецца.
Гора гнула без кашулі, а памёр – дык апранулі.
Беднаму ноччу і жонкі занадта.
Пустая кішэня, бо пустая жменя.
Сухі кашаль ад безграшоўя.
У шырокай кішэні грошай не знойдзеш.
У цеснаце – агульныя скочкі.
Ад бедных і Бог уцякае.
Каму амара клюшня, а каму капыт каня.
Адзін смакуе амары, другі – пра лустачку марыць.
Каму клюшні амаравы, а каму – хамуты гаспадаравы.
Сядзеш на мель – і рыбку ямель.
У цеснай хаце ладу мала.

Багатым ёсць каму слёзы сушыць.
Багатыя плакаць наймаюць плакалышчыкаў.
Мяшок грошай сам не ходзіць.
Крайняя хата для рыжых і гарбатых.
Ад собаля да рагожкі зусім трошкі.
Рагожа чыну не гожа.
Дапамогі чакай не ад багатага, а ад сумленнага.
Багаты можа, а сумленны дапаможа.
Багаты адкупіцца, бедны – адседзіцца.
У багатых – каровы рагаты.
Не поп Мікіта, а мае світу.
Футра бабра не заўжды да дабра.
Зубы на паліцы – скочкі ў нагавіцах.
Хоць на латцы латка – скача як цялятка.
Цягнем прасцінку на голую спінку.
У голага адна просьба да Бога, у беднага – дзвесце.
Згадзіцца і макуха, калі ў роце суха.

## НЕ БУДЗІ БЯДУ...

Не будзі бяду – будзе на віду.
Мілая хатка, ды няма таткі.
Сцены не глухнуць, дзе слёзы не сохнуць.
Воўк у капкане пра кіпцюры не дбае.
Пачатак ліха сытóю пахне.
Час ад часу цяжка Панасу.
Плач дзіцяці рве сэрца маці.
І на залаты пярсцёнак слёзы капаюць.
Як гора мінавала хату, то і ў халупіне дастатак.
Толькі з дна глыбокай ямкі крык ляціць
у адным напрамку.
Калі град на галаву – радасць аднаму шкляру.
Крывое рала жарабка ўматала.
За плач не купіш калач.

# КІЛЗАЙ ПАСАДУ...

Кілзай пасаду, інакш не зладзіш.
На высокіх пасадах, бядача, і цялят, і вар'ятаў пабачыш.
Ад шчырага посту не бывае росту.
Атрымае давер – прачынаецца звер, а свае пяшчоты абяцае на потым.

Меле, меле "як жывы", без паперкі, "з галавы".
На птушак высокага палёту – паляванне да адлёту.
Дурню, для парадку, спачатку даюць пячатку.
Былая "шышка" знайшла пасаду: зганяе скочак з крутога з... .
Да гэткіх вусоў бараду ў прыдачу – быў бы хлапец атаманам казачым.

Нічога не варты, а ў начальніках варты.
Хоць і злодзей, але ў варце ходзіць.
Выбіралі – выбралі, а празвалі выдраю.
Гундосіць: ні жне ні косіць.
Не задзірай высока нос: не заўважыш тых, хто падпаўзае.
Прыпек цесны, а колькі ж цвыркуноў жадаюць, каб іх слухалі.

Адпускаю грэшны дабрабыт па безналу і ў крэдыт.
У штаты пралез па блату, адпускае грахі за плату.
Хлусяць не людзі, а іх душы.
Схлусіў і рады: надбаўка да аклада.
Не пабаяўся схлусіць – прыплаціць мусяць.
Поўзае і джаліць, а пра неба марыць.
Не дойдзе прыказка ў вушы праз акуляры
глухім чынушам.
Хто многа гаўкаў – у таго багатая стаўка.
Хто добры "слаўка" – у таго добрая стаўка.
Паганае зелле добраму плоду жыцця не дае.
З высокай гары чалавека не відаць.
На мякіне і вадзе не расце ніхто нідзе.
Начальнік вар'ят – падхалім рад.
Начальнік лютуе – падхалім танцуе.
Не гаўкай, цябе і так пазналі.
У кожнага буйчыка свае алілуйшчыкі.
Хто ў крэсле – пуп не трэсне.
Сам дыпламаваны, а чакае пана.
Дзе цыган – там табар, а дзе чыноўнік – хабар.
Даў на лапу – заткнуў зяпу.
Для вялікай пысы і вялікая дуля.
Для вялікай пысы і вялікая міса.
Добра падмазаў – бліжэй да алмазаў.
Даваў на лапу і сам хапаў.
Хто каго тыкне, той таму мыкне.

## ДОБРА ДА СТА ЖЫЦЬ...

Добра да ста жыць, але колькі абутку знасіць!
Цягнуў пад сябе што бачыў, ды пайшоў
на той свет, небарача.
Цягнуў пад сябе, што мог, ды ўрэшце ўгневаўся Бог.
Цягнуў пад сябе штосілы, ды пайшоў да Абрама на піва.
Працягнуць ногі танней, чым жыццё.
Не кожнае жыццё расцягваецца.
Ногі працягнуў, а грошы ў казну.
Крыжы ставяць і безгаловым.

## УСЁ ВЯДОМА...

Усё вядома, хоць цэгла не салома
Сказаў бы, браце, ды рэха ў хаце.
Гаварыў не пра скварку на кухні, і цяпер ані чаркі,
ні куфля.
У абвіслых вушэй востры нюх.
Не падслухаў, дык унюхаў.
Даўганосы і цыбаты сцежкі круціць вакол хаты.
У глухой ночы зыркія вочы.
Усё вядома праз сцены дома.

# КАЛІ ВЕЦЕР ЗВЕРХУ ДЗЬМЕ...

Калі вецер зверху дзьме, не чакайце добрых змен.
Свежы вецер са спіны не ўспрымаецца.
Не біце ў ладкі, час не такі.
Пры грэшнай уладзе і чорт не ў накладзе.
Прымаўкам улады не кожны рады.
Уладнае брыво і добрую прымаўку да вока не дапусціць.
Ад дубца і брахні без турботаў утрое растуць намалоты.
Каму вяроўчыну, а каму парася – вось і праўда ўся.
Балея брахні і падману – вось і ўся праўда ў пана.
Хто да клеці, таму плеці.
Найлепшы агітлісток – уласны зрок..
Скінуць з воза – бабай станеш.
Падстаўляем спіну пераняць цагліну.
Якія песні пяём, так і жывём.
На экране:”ля-ля!”, “уха!”, а ў свіране – пыл з кажуха.
Добрыя справы “майстроў” баяцца.
Мы цешымся, а з нас пацяшаюцца.
Бліжняя спіна для іспыту бізуна.
Дарагую лыжку і аблізаць не дазволяць.
Наймацнейшы хамут на корках шампанскага.
Тоўсты карак патрабуе шкварак.
Крывы дышаль уверх глядзіць.
Прышыў новую латку – плаці падаткі.
Заплаці падаткі і прасі ў таткі.
Майстроў многа, ды ўсе грэшныя.
Час дурняў розумам кіраваць.

На троне не натрэш далоні.
Прамовы смакуеш – з кратом пасябруеш.
Вер людзям – панам пабудзеш.
Усе на аднога – чорту дапамога.
Мядзведзь футра мае, бо падаткі абмінае.
Усё перамелена, а мукі не намелена.
Ленінскі шалаш вырас у палац.
Будан у Разліве – палац на роднай ніве.
Сэрца па ўказах не жыве.
Ад іншых вуснаў дзёгцем пахне.
Вялікай галаве моцная шыя.
Курам на смех, падначаленым да ведама.
Доўгая прамова што доўгі бізун, ля ног блытаецца.
Мялі прамову сто раз панову.
Слова да слова, а сэнс не новы.
Каню – хамут, валу – ярмо, а для аратых – «тпру» і «но».
Кожны начальнік пад “бацькам” ходзіць.
Не тыя святыя, што па сценах вісяць.
Не чакай пяшчоты ля глухіх варотаў.
Не чакай пашаны ад высокай брамы.
На сценах “бажаняты” не выратуюць хаты.
Слухмянаму табуну і аднаго пагоншчыка досыць.
У пракурора і прэлюдыя – прэамбула.
Закон і дышаль у адных рукавіцах.
Гаварыў у вочы, расплаціліся з-за вугла.

## ВЕЦЕР З ПОЛЯ – ПЫЛ У ВОЧЫ...

Вецер з поля – пыл у вочы: быў калгаснік
– стаў рабочы.
Вецер з поля – пыл у вочы: барануем і валочым.
Бачыў слон кабылін сон.
Язык ля пячы запякае кулічы.
Хлус брэша – страх адганяе.
Казаў дзядуля: кувала зязюля.
Растакаваўся глушэц на такавішчы.
Плакала каня, як лазня гарэла.
Пыліць дарога ад парога да парога.
Прасіў дапамогі казлу на рогі.
Не давай чэснае слова хлусліўцам
– сам станеш хлусам.
Нагамі праўды не здабудзеш.

## СТРАШНЫ ЧОРТ НА СУШЫ...

Страшны чорт на сушы, што балоты сушыць.
Чорт кіруе дрыгвою з купіны.
Крывой рабрыны і нячысцік баіцца.
Для кожнага ў д’ябла свая мера, ды адна халера.
Цяжка вушы сценам чысціць, дзе жыве нячысцік.
Не расце чарот, дзе няма балот.
Памяняць дзень на ноч і чорт ахоч.
Прадаў душу сатане – скачуць чэрці па спіне.
Адзін нячысты ўсіх святых перапалохае.

## ЗАБЫЎ ДУРАНЬ РОЗУМ...

Забыў дурань розум – лягчэй будзе дарога.
Сваім носам не дзяўбанеш – чужы не дапамога.
Словы ў кішэні не носяць, а розуму ў дурня не просяць.
Для разумнай кнопкі не хапае клёпкі.
Бараны розум не сеюць, таму й не лысеюць.
Дурная галава і на калу смяецца.
Пашлі дурня законы пісаць.
Для дурня-свата адна адплата.
Благая каляіна ў глухі лес завядзе.
Лепш лупатымі сваімі, чым відушчымі чужымі.
Высушылі балоты – навошта боты.
Пустой галаве гантэлі не дапамогуць.
Дурням законы падпісаны.
Усё роўна каму маліцца, калі лоб чарапіца.
Кіеўскі дзядзька бузіну раздае.

Бузіну на лебяду – таксама бартэр.
Згубіў розум – не перажывай: хто-небудзь ды знойдзе.
Згубіў розум – не перажывай, людзі падзеляцца.
Доўга думаеш – чужым розумам жывеш.
Пустоты ў галаве сіліконам не запоўніш.
Пустата нараджае землятрус.
З дурнем піва не п’юць.
Разумнай галаве дурань месца не знойдзе.
Дурню Фядоту – добрую работу, а мудраму Фядосу – дулю да носу.

Дурняў брэх – курам смех.
Мудры след пакінуў, ды дурні затапталі.
Да сярэдзіны ракі мост не будуюць.
Разумная сцяжына чакае працягу.
У тлумную галаву светлая думка не просіцца.
Дурням няма адмовы, а разумным – шчасця.

## ВІНАВАТЫ ДЫПЛАМАТЫ...

Вінаваты дыпламаты, што ў Пятра пустая хата.
Пустая камора ў гультая Хвядора.
Накасіў стог на казліны рог.
Дзіркі ў плоце – пуста ў роце.
Дзе кіруе матка, вулей у парадку, дзе царуюць
трутні – там пустыя будні.

Спіць – багаты, прачнуўся – без зарплаты.
Багаты – як спіць на ложку, бедны – як звесіць ножкі.
Карова з языка: гаспадыні – у руку, гультаю – у шлунак.
Хлопцы як шафы, а ў свірнах дзіравыя дахі.
Упрэла Фядора, покуль крупнік змалола.
Бедавала Фядора: як крупнік агараць?
Скокі ды гулі кішэні прадзьмулі.
Апынуўся на мелі, а зайздросціць Ямелю.

## КАЛІ Ў РОЦЕ СУХА...

У роце суха – за сталом глуха.
Самагон на жыце – п’яны ў карыце.
Праз карчму вясёлы йдзеш – слёзы ў хату прынясеш.
Набраўся як сучачка скочак.
Прапушчаную ў маладосці чарку старасць не дагоніць.
Лішняя чарка ракам поўзае.
Вока – на чарцы, зуб – на скварцы.
Вока на чарцы – зуб не баліць.
Ад чаркі і скваркі грымнулі сваркі.
Сеў на каня «белага» – не ўбачыш свету белага.
Мычанне п’янага – бляянне баранава.
Для такога гарла гарэлка з вядра.
Дзе блін камяком – там і чарка колам.
Узараў абы-як – і чарка не ў смак.

## СЦІХНУЦЬ НЕ ПРАШУ...

Сціхнуць не прашу, ды не лезь у душу.
Крычы не парвіся – пра здароўе клапаціся.
Заткні горла, каб язык не сцёрла.
Баялася Гануля язык намуляць.

## ДАЗВОЛЬ, МАЛАДЗІЦА....

Дазволь, маладзіца, да бока прытуліцца.
Не шануй, дзеўка, спадніцу: можаш спазніцца.
Весялуха-дзеўка што мядку вядзерка.
Дзявочы шал губляе шаль.
На возе – кума, як злезла – баба.
На возе – кума-куміца, як злезла
– няма на што дзівіцца.
Галодная цётка любога дзядзьку засоліць.
Галодная Магрэта не будзе чакаць лета.
У ласкавай цёці дзядзька ў аброці.
Відаць, наш хлапец уліп пад вянец,
бо ваша маладуха ў капне прыпухла.

Такая маладзіца толькі ўночы згадзіцца.
Каму жонка няўмека, таму суседка ўцеха.
У суседкі сажа белая.
Трымай, Антося, свайго Савося.
Абы для кога няма нічога.
Не работа ў рукавіцах, не каханне ў нагавіцах.
Паспачуваў Кузьма Ганцы, паказаўся мамцы.
Выскубла сярпочкі – і змарнелі вочкі.
Бровы-сярпочкі салодзяць ночку.
Сваталі маладзіцу, а звялі з тыгрыцай.
Начапіў казе аброць – жаніхоў хутчэй прыводзь.

Лаянка мілых аднаму з іх заўжды ўцеха.
Першая лаянка – размінка перад апошняй.
Пекныя ножкі, ды ў галаве трошкі.
Жывеш слепатою з не тою.
Маўчала трапала, ды бабам папала.
Натура не "ух", ды мастак зух.
Чакаць не ліха, была б "зубрыха".
Чакаць не гора, прыйшла б Фядора.
Захацець сыночка – будзе малой ночка.
Можна і ў гадах, калі маладзіца – ах!
Я ж нікому, ніколі, нічога, ніяк, а каму якое
– дык што ж тут такое.
Да дзяўчат зазвалі, то й забыў як звалі.
Пойдзеш да кабетак, то й забудзеш дзетак.
Маладзіца што ласіха – сцеражыся: схопіш ліха.
Дамаўляўся на сене з Ануляй, а за лесам, гарою пачулі.
Халастыя рагоў не носяць.
Залацісты галасок склікае на часок..
Калена аб калена трэцца – душа саграецца.
"Соладка"і "сорамна" носяць адны нагавіцы на дваіх.
Для кожнага мілага – свае завушніцы.
Да вяселля зажыве, пасля вяселля адгукнецца.
Свечка гасне – жыццё нараджаецца.

А каму якая справа, што кума ляжала справа.
Без любові на саначках і горачка ў ямачках.
Запалілі свечку – укарацілі ночку.
Не хвалі халявы з каханкай ля лавы.
Завёў каханку – слухай сэрца зранку.
Спаткала Марыся: саграшыў – жаніся.
Думала кума думу, як прыйшла ад кума.
Спакуса – панадлівая дзеўка без узросту.
Выйшаў з бярлогу – начапіў рогі.
Памяняў татка матулю на дулю.
Бартэр з глузду звёў татулю: прывёў новую мамулю.
І пад удавой салома трэцца.
У граху кароткае свята.
Ранішні смех на вячэрні грэх.
Даўняя любоў палыном пахне.
Сорам маладосці вярэдзіць душу старасці.
Добрая Яўгеня, ды пустая кішэня.
Выбіраў каб стан, каб вусны, а цяпер жыве з распуснай.
Добрыя лыткі, ды пустая калітка.
Добрая скарынка, ды цесная скрынка.
Заляцеў Панас на квас, а ў маладзіцы няма й вадзіцы.
З грашыма ў кішэні – і дзеўкі ў жмені.
Жыццё злуецца – каханне рвецца.

## ШТО ЦЯЛУШКА, ШТО БЫЧОК...

Што цялушка, што бычок – вяровачка ды ланцужок.
Сыты воўк адпачыў: худой казе рабрыны лічыў.
Сабака на долю злы: побач адны казлы.
Сабака брэша ад страху пазбавіцца даху.
На хілага сабаку – шалёную атаку.
Брашы, сабака, на гаспадара – дурнем пойдзеш са двара.
Ваўку няма карысці капусту грызці.
Падораны конь зубы паказвае на другі дзень.
І ў агульнай загарадцы ў кныра сваё карыта.
Ашчыпаная гусь пра волю не дбае.
Куры не парсюкі, каб у гразі купацца.
Бясхвостая цялушка капытам б’ецца.
Значаная авечка ваўку не ўказ.
Без пеўня курам на седале сумна.
Бабуліна седала курэй ведала.

З добрым быком каровы з малаком.
Добрая цялушачка заўсёды каля вымя.
Навучы мядзведзя мыцца – з вады не выцягнеш.
Сярод авечак казёл – атаман.
Лісе ды воўчую зяпу.
Задаволены жарабок капытамі гаспадара “лашчыць”.
Галодныя ваўкі ў зграю збіраюцца, а людзі
– па свету мыкаюцца.

Воўк сваё футра сам не скіне.
З аднаго карыта елі, а свінкі аўдавелі.
Адно карытца, ды лычыкі розныя.
Малады парсючок да дармавога карыта пад чэравам пралезе.
Вінавата авечка: каля лесу жыла.
Стары конь каляіну знойдзе.
Пакахала каза – чакай казлянятак.
Галодны бык каровы не бачыць.
Без пеўніка Яшкі чубаткі манашкі.

## ХАЦЕЎ ЦЕШЧЫ ДАГАДЗІЦЬ…

Хацеў цешчы дагадзіць: хай ля прыпечка сядзіць.
Без душы хата ў цешчы рагатай.
Мяняе цешчу мужычок на падраны кажушок.
Найшоў сваху – хоць язык на плаху.
Свякруха як завіруха: шумна сустракае,
ды холадам ахінае.
Жалоба па цёшчы з гадавым гарантыйным тэрмінам.
Ні сыну жонка, ні бочцы затычка.
Нявесты на здароўе не скардзяцца.

## ВОСЕНЬ – З МЕХАМ І КАШОМ…

Восень – з мехам і кашом, зімка – з лыжкай і каўшом.
Віхура лістапада – зімовая коўдра сада.
Сонца й кветка – мядок дзеткам.
Хуткая вясна ранак будзіць.
Маленькі нос шчыміць мароз, а вялікі – кусае.
Цікаўны мароз і пад сукню залезе.
Не кожны люты снегам надзьмуты.
Маланка зверху: бах ды бах! Наганяе стрэхам страх.
Па вясне і дзятлам галовы баляць.
Да ног у ліпні валёнкі не ліпнуць.
Доўга зіма чакае лета і старыцца.
Звяры зімою не лысеюць.
У вясны – кветкі, а ў восені дзеткі.
Улетку на голым камары гасцююць.

## НЕ КОЖНЫ...

Не кожныя дакопіны цешаць Пракопіху.
Не кожныя дажынкі радасць для Марынкі.
Кожнай скацінцы па хварасцінцы.
Кожны маньяк бачыць свой маяк.
Не на кожны сучок і сарока сядае.
Кожнае бяздонне мае сваю крыніцу.
На кожную шыю свой хамут.
Не кожны канец маладзец.
Кожная ягадка сваім смакам адметная.
Не кожная рыбка глыбіню любіць.
Не на кожную кветку пчолка ляціць.

## АЛЕ Ж...

Маю час, але ж грошай няма.
Безліч мараў, а спраўджваеш дурную.
Многа гною, ды мала ўдою.
Хутка з'ядае, але ж доўга спіць.
Удала крочыў, ды чорт сурочыў.

# КАСТУСЬ КАЗАЎ...

Кастусь казаў: шэры шэрага звязаў.
Рыторыку, бывае, заіка выкладае.
Добраму быку тэлебачанне па баку.
Ранішнія званы далёка чуваць.
Голага здалёк відаць.
Кулаком слязу выціраюць.
Папаў у балота – трымайся ля плота.
Сячы лес – гушчар вырасце.
Памажы калінай – вернецца малінай.
Дзе згубіў, ведаеш, але згубленае доўга не ляжыць.
У званы для пацехі не б'юць.
Гаспадар з мяжы – хлеб з печы.
Перайшоў поле – азірніся.
Кусай чужыя локці, свае пакінь бліжнім.
Дай зямліцы есці – будзе мяса ў цесце.
Лаві юду на вуду.
Хто гандлюе – не бядуе.
Бярлог аднамесны цесны.
Калі гара з гарою сыходзяцца – людзі гінуць.

Прыгожае цела любяць, а прыгожы характар цэняць.
Духоўная ежа і для цела адзежа.
Для душы – абярог, для цела – пірог.
У даронага каня чатыры нагі, а ў абяцанага – шэсць.
Хто носіць камень за пазухай,
хто трымае яго на душы.
Камяні душы стаяць на магілах.
Аб камень за пазухай і конь спатыкаецца.
Зайздрослівыя вочы і пражэрлівы рот не
знаюць душэўных турбот.
Беднага вочы плачуць, што багатага свет бачаць.
Кавун ці дыня – адна гаспадыня.
Гарох ды боб што ў сцяну, што ў лоб.
Чужыя грошы ноччу будзяць.
Ад калыскі да кладоў сто гадоў без даўгоў.
Чысціня ў хаце, куды ж сплюнуць, браце.
Малы клін выбіваюць мацнейшым, вялікі – талакою.
Сячы лес – трэскі згніюць.
Поп хрысціць крыжам, кілер – “макаравым”.
Усякае тапарышча ўрэшце становіцца попелам.
Бура пачынаецца са штылю.
З доўгай вяроўкі многа канцоў.

І на лаўца-малайца ёсць пастка.
Згубленае шукай наперадзе.
Новая мятла да падлогі прыглядаецца.
Які лёс – такі авёс.
Першую песеньку голенькі пяе.
Ноччу сава не горш сокала.
Пасля бойкі кулакі чысцяць.
Паваяваў Пеця – падумай аб марафеце.
Баязлівы трасе кулакамі за весніцамі.
Пташачка заспявала кошачцы на котавай місачцы.
Утульна блыхастай футры сярод людскіх кучмаў.
Не ацеліцца вяроўка, а то была б кароўка.
Доктару пашана, калі хвароба пагана.
Хворы ў хаце – доктар пры зарплаце.
Адзін адразу, а другі праз заразу.
Хапай карга: твая чарга.
Скнара і з-пад ліха здыме пенкі.
Хваліўся хвалько, ды вядзерца працякло.
Кінь хваліцца, дзюрка ў нагавіцах.
Хваліўся Мікіта разбітым карытам.
За хату з краю мацней лупцуюць.

Пасля пажару толькі попел танцуе.
Ходзяць тут усякія, анучы прападаюць.
Пайшоў бераг да ракі ў сваты.
Доўгая нітка хутчэй заблытаецца.
Нячыстыя рукі, бруд на душы – заўжды спарышы.
Ушчыкнула страла камень.
Напрасіўся ў сябры – душу не дзяры.
Моцнае слова пад аховай закону.
Вецер словы носіць – доля справы просіць.
Слова – толькі гук, доля просіць рук.
Прадаў бліжняга – дай грошы пад працэнты.
Доўгае цярпенне абавязкам стане.
Бог шэльму значыць, а той не знае, не бачыць.
Вырадак мафіёзнай сям'і – алігарх-адзіночка.
Спачатку зубы, пасля – клыкі.
У балоцістым краі надзьмутыя адпачываюць.
Пакрыўджаныя нараджаюцца ў засуху.
Цягай Апраска: твая вязка.
Вочы трымаюць зубы ў пакоры.
Беражы не беражы: у кожнай сукенкі свой час.
Паганыя вочы патыліцу свідруюць.
Трымай лысага за чуб.

***

Грэшнікам месца ля катла, грэшніцам – ля ночваў.
З пекла голас не вяртаецца.
І святых жыццё не песціць.
Святому і ў куточку светла.
Свечка куткоў не баіцца.
Грэшнага і вецер па твары лупцуе.

***

Танцуе як шкварка на патэльні.
Вочкі як у шалёнага акунька.
Дапамог як певень сапсаванаму гадзінніку.
Восень як маладая на фэсце.
Загарэўся як восеньскі клён.

***

Ад шапкі да папахі вырастаюць страхі.
Сякера лесу страх наводзіць.
Сякера ў лесе жах наводзіць.
Нават воўчым салам каня спалохаеш.

***

Весяліся, курчаня, пакуль ястраба няма.
Чысты гумар кляўзай не запэцкаць.
Вострае слова ў брудзе не захрасне.
Спяшайся людзей смяшыць – парадуеш.
Змудрыў няўмеха курам для смеху.

***

Сунуў спіцы ў нагавіцы, а шукае на паліцах.
Камарыха кусае, а камар страх наганяе.
Раней пастарайся, а потым карыстайся.

***

Не чакай лебедзя: крумкачы задзяўбуць.
Вялікі горад – што вялікі лес:
не хадзі з адкрытай зяпай.
Што прапала, тое не наша.

Не таго бойся, у каго кій у руках, а таго
– у каго рукі ў кішэнях.
Не паказвай язык: адкусяць.
Даюць – не бяры: хутка будуць біць.
Сам – надзейна; не шукай дабрадзея.
На сабачае вяселле са сваім “жадаю” не лезь.
Камара ў госці ніхто не кліча.
Не махай рукамі – сустрэнуць кулакамі.
Тоўстая нітка не для тоненькага вушка.
Бочку дзёгцю не засалодзіш лыжкай мёду.
Хаўтуры – не вянчанне, сэкс – не каханне.
Пад бізуном абух не ходзіць.
Ад цемры навучання святло не ўспыхне.
Без навукі нават цвік сцяне не патрэбны.
Амёбам стаматолаг не патрэбен.
Нябожчыкі камень на душы не носяць.

Не даеш, Божа, саломкі падкласці, не дай
і ў бруд упасці.
Не шкадуй сябе для добрых спраў.
Не вер таму, што будзе, вер таму, што было.
Свежы вецер са спіны не ўспрымаецца.
Чужая галава не забаліць, калі свая не балела.
Жывыя ракі ад сораму не чырванеюць.
Капелюшу не сорамна.
Даў слова – не забудзь забраць грошы.
Вяроўка не ацеліцца, вуздэчка не ажарэбіцца.
Верхаводцы глыбіня не патрэбна.
На ўсіх сярдзітых вады не хопіць.
Лёд марозу не баіцца.
Сухое балота кулік не хваліць.
У мухі нічога не прападзе.
Без ветру лес не загудзе.
Сланечнік свайго ценю не бачыць.

# ЗМЕСТ

З горыччу і гумарам... *Мікола Сянкевіч* .......................... 3

САБЕ І ДРУГІМ ........................................................... 7

КАНАПКІ
Так і жыву ........................................................... 29
Шчасце на парог ..................................................... 30
Запавет для сына ..................................................... 31
Мінулае – тваё ....................................................... 32
Старасць на спіне ................................................... 33
За чужы грош ........................................................ 34
Згарэла на злодзею шапка ......................................... 35
Чорнае не адбеліш ................................................... 36
Хлуслівае і крадзенае .............................................. 37
Што накапалі ......................................................... 38
Спазніўся да стала Адам ........................................... 39
Бедны не плануе ..................................................... 40
Не будзі бяду ......................................................... 43
Кілзай пасаду ........................................................ 44
Добра да ста жыць ................................................... 46
Усё вядома ........................................................... 47
Калі вецер зверху дзьме ............................................ 48
Вецер з поля – пыл у вочы ........................................ 50
Страшны чорт на сушы ............................................. 51
Забыў дурань розум ................................................. 52

Вінаваты дыпламаты ..................................................... 54
Калі ў роце суха ............................................................... 55
Сціхнуць не прашу ........................................................... 56
Дазволь, маладзіца ........................................................... 57
Што цялушка, што бычок ................................................. 60
Хацеў цешчы дагадзіць .................................................... 62
Восень – з мехам і кашом ................................................ 63
Не кожны ............................................................................ 64
Але ж ................................................................................... 65
Кастусь казаў ..................................................................... 66